# аiв

АДУКАЦЫЯ і ВЫХАВАННЕ 1 '95



**У нумары:**

Сацыяльнасць у святле прыродазнаўства

Каштоўнасныя арыентацыі ў кантэксце сацыякультурнага зместу адукацыі

Фармаванне навуковых паняццяў на ўроках

У дапамогу педагогу: гісторыя Бацькаўшчыны

грамадскіх установах, сферы адукацыі. Менавіта таму асаблівую значнасць набываюць цяпер глыбокі аналіз і ўлік як станоўчых, так і адмоўных бакоў палітыкі беларусізацыі 20-ых гг.

"У сярэдзіне 20-х гадоў актыўна ішлі працэсы пераводу дашкольных і школьных устаноў на беларускую мову выкладання. Напрыклад, у пачатку 1926 года ў БССР дзейнічалі 4042 чатырохгадовыя школы сацвыху, пры гэтым 3357, ці прыкладна 85% з іх, працавалі на беларускай мове. Меншы працэнт беларусізацыі назіраўся ў школах-сямігодках (у 1926 г. — толькі 80 з 196 поўных сямігадовых школ працавалі на беларускай мове). Акрамя аднамоўных школ, тэхнікумаў, рабфакаў, існавалі ў той час і ўстановы з выкладаннем на змешанай мове (руска-беларускай, беларуска-польскай і г.д.).

Да 1928 г. курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў былі цалкам беларусізаваны, а сельскагаспадарчыя школы і тэхнікумы, прафшколы і рабфакі на 60—80% перавялі сваю працу на беларускую мову" [4, 97].

Але беларусізацыя ў 20-ыя гг. усё ж мела незакончаны характар з-за суб'ектыўных перашкод і ўнутранай непаслядоўнасці; да сярэдзіны 30-ых гг. яна, практычна, была знішчана ў межах БССР. З гэтага моманту набралі моц супрацьлеглыя ёй накірункі ў рэчышчы сталінскіх рэпрэсій. Знішчаліся самі носьбіты нацыянальнай ідэі.

І вось, грунтуючыся на гістарычным вопыце нацыянальнай адукацыі, мы падышлі да аднаўлення нацыянальнай адукацыйнай сістэмы. Шлях да Хораму Духоўнасці ляжыць праз гісторыю, яе глыбокае асэнсаванне. Пройдзенае нацыяй — гэта не цяжар, які запавольвае далейшы рух і які можна з сябе скінуць. Досвед мінулага натхняе ў творчасці, але і засцерагае ад паўтарэння ўжо зробленых памылак.

1. *Абдзіраловіч І.* Адвечным шляхам. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 43 с.

2. *Васілеўскі П.* Хлеб і кніга / З гісторыяй на "Вы". — Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. — С. 36—51.

3. *Грымаць А.* Перспектыва //Настаўніцкая газета. — 1993. — 30 кастрычніка.

4. *Дубянецкі Э.* Дасягненні і цяжкасці ў правядзенні беларусізацыі ў 20-я гады /Беларусіка. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — С. 94—99.

5. Жемчужины мысли. — Мн.: Беларусь, 1987. — 432 с.

6. *Лыч Л.* Беларуская нацыя і мова. — Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. — 277 с.

7. *Лыч Л.* Каб жыла Беларусь // Полацак. — Кліўленд, ЗША. — 1991. — № 9.

**В.С.Болбас,**
*кандыдат педагагічных навук*

# "Не толькі свечу мей..."

## Этыка-педагагічныя погляды братоў Лаўрэнція і Стэфана Зізаніяў

Не многім з педагагічных і грамадскіх дзеячаў Беларусі эпохі Адраджэння ўдзялілі айчынныя і замежныя даследчыкі столькі ўвагі, як братам Лаўрэнцію і Стэфану Зізаніям (Тустаноўскім). Тлумачыцца гэта значным укладам, які яны ўнеслі ў развіццё асветы ўсходнеславянскіх народаў, а таксама фізічнай захаванасцю іх твораў у навуковым ужытку. Дэталёваму, узважанаму разбору падвергнуты многія бакі грамадска-асветніцкай дзейнасці гэтых выдатных вучоных, але, на жаль, практычна нідзе не аналізуюцца тыя напрацоўкі, якімі папоўнілі знакамітыя браты тэарэтычныя асновы маральнага выхавання ў айчыннай грамадска-педагагічнай думцы. А між тым менавіта маральна-выхаваўчы аспект дамінаваў у творчасці большасці беларускіх мысліцеляў XVI—XVII стст., у тым ліку і братоў Зізаніяў.

Мушу заўважыць, што хаця Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, верагодней за ўсё, нарадзіліся на ўкраінскіх землях (там яны пэўны час і працавалі), значную частку свайго свядомага жыцця браты прысвяцілі развіццю асветы на Беларусі. Сама глеба духоўна-культурнага быцця беларускага грамадства канца XVI — пачатку XVII ст. садзейнічала таму, што якраз гэты перыяд навуковай і педагагічнай дзейнасці Зізаніяў быў адным з найбольш плённых. Вось чаму наш народ, нароўні з братнім украінскім, мае ўсе падставы лічыць таленавітых мысліцеляў сваімі сынамі.

Звярну ўвагу чытачоў і на тое, што сацыяльна-філасофскія погляды Лаўрэнція і Стэфана, іх падыходы ў галіне грамадскай дзейнасці многія даследчыкі трактуюць нярэдка як супрацьлеглыя. Безумоўна, ёсць пэўныя падставы для такіх сцвярджэнняў, але, на маю думку, гаворка тут можа ісці не пра адрознасць, а пра выяўленне творчай індывідуальнасці кожнага з братоў-паплечнікаў. Бо асноватворныя ідэі і галоўныя накірункі іх дзейнасці былі сугучнымі і падобнымі паміж сабой.

Аб блізкасці пазіцый Стэфана і Лаўрэнція сведчаць факты іх сумеснай працы. Паводле дакументальных крыніц, да 1592 г. браты з'яўляліся настаўнікамі-дыдаскаламі праваслаўнай брацкай школы ў Львове. У 1595 г. Стэфан робіцца рэктарам слыннай Віленскай школы пры Святатроіцкім брацтве, што імкнулася ператварыцца для праваслаўных вернікаў у тое, чым для католікаў быў Віленскі універсітэт. У тым жа годзе на пасаду настаўніка гэтай школы паступае Лаўрэнцій (пераязджае з Бярэсця). У 1596 г. Віленская брацкая друкарня выпускае "Азбуку" Л.Зізанія, куды арганічна ўваходзяць "Стефана Зизания изложения о православной вере". Падобныя факты сведчаць аб тым, што Лаўрэнція і Стэфана яднала не толькі кроўная, але і духоўная сувязь.

У поўнай адпаведнасці з перадавымі традыцыямі свайго часу браты Зізаніі вышэйшы сэнс чалавечага быцця бачылі ў фармаванні высокай духоўнасці, ва ўдасканаленні маральнай прыроды чалавека. Таму значную частку жыцця яны прысвяцілі рэлігійнай, прапаведніцкай дзейнасці. У сваім апошнім буйным творы "Катэхизис Великий" (1627) Л.Зізаній разважае аб сутнасці і прызначэнні чалавека і прыходзіць да высновы: для маральнага ўзвышэння асобы не існуе межаў. Менавіта такія перакананні прывялі ў сапраўдны жах артадоксаў праваслаўнай веры. Паводле архіўных крыніц, на ключавое пытанне патрыярха ўсея Русі Філарэта "Что есть человек?" Лаўрэнцій "дерзостно и зело смело" адказаў: "Непостижна сия вещь" [1, *142*].

Л.Зізаній быў упэўнены, што кожны чалавек можа і павінен, кіруючыся Божымі запаветамі, пры дапамозе ўласных намаганняў узняцца да духоўных вяршынь і маральнай дасканаласці. Абапіраючыся на асобныя тэзы біблейскай кнігі "Другазаконне", ён, пад уплывам заходнееўрапейскай рэфармацыйна-гуманістычнай думкі, у катэгарычнай форме заяўляў: "Самовластием человек обращается к добродетели, якоже и злобам, им же почтен быть исперва Адам от Бога" [2, *93*]. Л.Зізаній адзначаў валявыя якасці чалавека як найважнейшы фактар духоўнага ўратавання. На думку педагога, чалавек, нібы ваявода, распараджаецца сабой як захоча: ці выконвае закон, ці не. Лаўрэнцій схіляўся да думкі, што сам Бог надзяліў чалавека правам у значнай меры тварыць свой лёс самастойна. Асветнік "вызваляў" кожнага індывіда з-пад апекі афіцыйнай царквы, прадстаўнікі якой сцвярджалі залежнасць і пакорлівасць чалавека.

Вучоны неаднаразова выяўляў сумненне адносна асноўнага пастулата хрысціянскай веры, паводле якога чалавек, з-за першароднага граху, больш схільны да злога, чым да добрага. На яго думку, духоўныя сілы ў кожным Бог захаваў такімі, якімі яны былі ў Адама да грэхападзення. Людскія заганы Лаўрэнцій тлумачыў спакусай д'ябла, які выкарыстоўвае слабыя бакі чалавечай прыроды: пачуццёвасць, пыхлівасць, славалюбства. Падобнымі поглядамі Л.Зізаній быў вельмі блізкі да сацыянства, дзе таксама адмаўлялася амаральнасць чалавечай прыроды з-за грахоў Адама і Евы.

Л.Зізаній наогул не згаджаўся ні з прадвызначанасцю чалавечага лёсу, ні з фатальнасцю ўплыву на яго з боку звышнатуральных ці прыродных сіл. Калі ў Маскоўскім патрыярхаце рабілася спроба абвінаваціць Лаўрэнція ў распаўсюд-

жанні поглядаў аб падпарадкаванасці долі чалавека нябесным сяцілам, асветнік катэгарычна заявіў, што ён супраціўнік такіх меркаванняў.

Ерэтычнымі лічылі праваслаўныя святары і думкі Стэфана Зізанія, які таксама крытычна ставіўся да традыцыйных дагматаў царквы, яе статуту, культу святых і да т.п. Стэфан, аўтар знакамітых палемічных твораў "Катехизис" (1595) и "Казанье Кирилла, патриарха иерусалимского, об антихристе" (1596), рашуча выступаў супраць прымусовага акаталічвання праваслаўнай часткі насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, пазбаўлення людзей свабоды веравызнання, якой славіліся беларускія землі да першай паловы XVI ст. Стэфан, як і Лаўрэнцій, лічыў, што прымус у выбары веравызнання — гэта антыхрысціянскі падыход да выхавання асобы. С.Зізаній кідае з'едлівыя папрокі той частцы праваслаўнага духавенства, якая перайшла ва уніяцтва і схіляе іншых прыняць гэтую веру. Усхваляючы ідэі талерантнасці, ён пісаў: "Не только до ереси отщепенства, але и до щирое веры през кгвалт и войну абы жадного не притягали" [6, *34*].

Разам з тым было б значным перабольшваннем інтэрпрэтаваць ідэі братоў-асветнікаў як спробу секулярызацыі адпаведных кірункаў айчыннай этыка-педагагічнай думкі, бо дабрадзейнае жыццё, паводле іх уяўленняў, прынцыпова немагчымае без хрысціянскай веры. Але надзяленне чалавека правам самастойнага выбару тых ці іншых учынкаў, той ці іншай лініі паводзін патрабавала ад яго валодання маральнымі ведамі, асэнсаванага іх выкарыстання ў жыцці. *Вось чаму ў аснову маральна-выхаваўчага працэсу асветнікі паклалі інтэлектуальна-разумовае развіццё асобы, калі мудрасць, веды, адукаванасць не толькі ператвараюцца ў базу фармавання добрых нораваў, але і набываюць статус самакаштоўнасцей.* Такое стаўленне да свету і чалавека выявілася ўжо ў ранніх творах братоў Зізаніяў.

Не выпадкова, што першай з выдадзеных кніг Л.Зізанія была "Азбука", поўная назва якой — "Наука ку читаню и розуменю писма словенского, тутыж о святой троици и о вьчловечении господни". Яна дапамагала навучыцца чытаць, пісаць і давала першапачатковыя звесткі аб прыродзе і грамадстве. У гэтую кнігу арганічна ўваходзіў "Лексіс", дзе Лаўрэнцій тлумачыў значэнне больш як тысячы слоў.

У адпаведнасці з тагачаснымі традыцыямі любы буквар павінен быў выконваць не толькі прагматычна-адукацыйныя, але і функцыі маральнага выхавання дзяцей. Не было выключэннем і выданне Лаўрэнція Зізанія. У ім змяшчаліся этыка-рэлігійныя казанні, маральныя пастанаўленні, біблейскія запаветы і іншыя падобныя да іх тэксты, а ў "Лексісе" даваліся тлумачэнні многіх слоў, якія мелі непасрэднае дачыненне да выхаваўчага працэсу. Так, *пакаранне* ён тлумачыць як *навучанне*. Цікава, што адным з сінонімаў слова *жыццё* ў Л.Зізанія з'яўляецца *выхаванне, праўда* тлумачыцца як *справядлівасць, дзёрзкасць* як *смеласць, ліслівы чалавек* называецца *валацугам, крывадушны — аблудным*. Такім чынам, у лексічным тлумачэнні ўтрымліваецца і своеасаблівая маральная ацэнка таго, што адпавядае змешчаным у слоўніку словам.

Трэба адзначыць, што "Азбука" Лаўрэнція Зізанія была ва ўжытку многіх тагачасных школ Беларусі, адыгрываючы значную ролю ў пашырэнні асветы сярод амаль усіх слаёў насельніцтва, спрыяючы маральнаму выхаванню дзяцей і моладзі.

Акцэнт на разумовыя пачаткі ў арганізацыі выхаваўчага працэсу, на ўсведамленне актыўнай ролі кожнага чалавека ў сваім маральна-духоўным сталенні — адметная рыса педагагічнай спадчыны Зізаніяў. Усё, што звязана з авалоданнем ведамі, браты падпарадкоўваюць прынцыпу асэнсаванага і крытычнага падыходу да навучальнай дзейнасці. Яскравым прыкладам такога стаўлення да адукацыі з'яўляецца грунтоўны падручнік славянскай мовы — "Грамматика словенска" (1596) Л.Зізанія. Ужо самім выданнем гэтай кнігі Лаўрэнцій рашуча абвяргаў погляды тых вучоных-педагогаў, якія сцвярджалі, што славянскія мовы не прыдатныя для навукі, паўнацэннага вывучэння, бо не маюць і не могуць мець добра распрацаваных граматыкі, рыторыкі. Сапраўды, напісаныя ў тыя часы тэксты на старабеларускай мове былі складанымі для чытання і ўразумення: часта асобныя словы і сказы

пісаліся ў іх злітна, мала і адвольна ўжываліся знакі прыпынку. Таму Л.Зізаній і палічыў граматыку тым ключом, пры дапамозе якога можна адчыніць дзверы ў царства ведаў. Уласцівая падручніку скіраванасць на развіццё і самаўдасканаленне асобы патрабавала асэнсаваных, крытычных адносін да прачытанага, спрыяла фармаванню ў вучнях патрэбы самастойна думаць. У “Епиграмме” на сваю славутую “Грамматику” Лаўрэнцій пісаў: “Котории прагнут быти досконали, в писме и в словах абы неплытали. Аие известно все познавали, и чегося учат абы добре знали” [1, *138*]. Згаджаючыся з Катонам, ён сцвярджаў: чытаць не разумеючы — смеху варта [3, *3*].

Л.Зізаній паглыбляў і развіваў Скарынаўскія ідэі аб магчымасці і неабходнасці дасягнення мудрасці і добрых нораваў праз родную мову. Як і славуты славянскі педагог Я.А.Коменскі, Лаўрэнцій лічыў, што менавіта матчына мова, як ніякая іншая, можа дапамагчы чалавеку зрабіцца больш дасканалым і ўпэўненым у сваіх сілах, і рупіўся, каб у імкненні да агульначалавечых каштоўнасцей людзі не парывалі сувязі з нацыянальнымі каранямі.

Аб тым, як ставіўся Лаўрэнцій Зізаній да свядомых, асэнсаваных адносін да маральных ведаў, сведчаць яго тлумачэнні маральна-рэлігійных тэкстаў. Педагог-практык разумеў, што толькі глыбокае засваенне маральных прадпісанняў можа зрабіць іх накіравальнай сілай чалавечага жыцця. Адно з арыгінальных выданняў Л.Зізанія “Толкованіе молітвы которой научил господь Ісус Христос оучеников своих” [4] захавалася да нашых дзён і знаходзіцца ў Бадлейскай бібліятэцы Оксфарда. Гэтае тлумачэнне выяўляе, з якой удумлівасцю і пільнасцю ставіўся Лаўрэнцій да “духоўнага хлеба”, які клопат праяўляў ён аб глыбокім усведамленні багаслоўскіх трактатаў. Возьмем, напрыклад, першы радок самай распаўсюджанай з малітваў “Отче наш иже еси на небесех”. Прапаведнік павучае, што ўжо ў першым яе сказе заключаны аж пяць сэнсавых адценняў. Першае — калі мы “мовимо отче”, то мы ўпэўнены, што наш зварот “будемо выслуханы, поневаж отца просимо”; бацька ж не можа не звярнуць увагі на сваіх дзяцей. Другое адценне, на думку Л. Зізанія, заключана ў гэтым жа слове, бо, калі мы дзеці такога бацькі, то і “пристоит быти сынови таким, якій его отец небесный, тоест милосердным, благоподатливым, добродетельным”; трэці сэнс трэба бачыць у слове “наш”, бо калі ён “отец” для нас усіх, то мы — “все братя”, г.зн. і жыццё сваё мы павінны будаваць так, каб клапаціцца не толькі аб сабе, але і аб братах сваіх. Чацвёртае адценне — таксама ў гэтым жа слове, бо яно азначае: усе мы родныя, "иж все маемо един заровно и тоиже титул и шляхетство небесное. Пристоит теды абы едины над других не подносилися, ане о собе болше розумели, так королеве и панове над подручных своих, так богатый над убогих, як тыжи мудрти и ученыя в писме над простаков”. І пятае сэнсавае адценне трэба бачыць у словах “иже еси на небесех”: усе нашы думкі, памкненні і справы павінны ў першую чаргу скіроўвацца на неба — на ўдасканаленне душы, маральнае ачышчэнне [4, *7—8*].

Рэнесансныя дзеячы Беларусі разумелі, што імператыўна-дэкларатыўны характар маральных прадпісанняў, з дапамогай якіх многія прапаведнікі імкнуцца дасягнуць духоўнага аздараўлення грамадства, не спрацоўвае ва ўмовах набліжэння новай эпохі. Акцэнт павінен быў рабіцца на інтравертны характар фармавання маральнасці чалавека. А гэта значыць, што кожны індывід ужо не мог разглядацца як ёмістасць, якую трэба напоўніць дабрачыннасцю. Вось чаму слынныя айчынныя педагогі не пагаджаліся з Сакратам, які лічыў, што ведаць добрыя норавы — значыць іх прытрымлівацца. На думку братоў Зізаніяў, *маральныя веды павінны з'явіцца неабходнай асновай фармавання прыстойнай асобы. І ўсё ж не яны, а добрыя справы вызначаюць узровень маральнасці чалавека.* Л.Зізаній нават уявіць не мог “веру без добрых учинков”, бо “едино без другого нечого не важыть” [5, *59*]. С.Зізаній падобныя думкі сфармуляваў у высокіх паэтычных радках, якія і сёння гучаць узнёслым акордам дабрачыннасці і як бы падсумоўваюць маральна-выхаваўчыя погляды знакамітых братоў: “Не толькі свечу мей, але старайся жебы и горела, абыся светлом указала справ твоих добрых пред человеки” [6, *82*]. У адрозненне ад многіх прадстаўнікоў афіцыйнай царквы, якія добрыя справы ба-

чылі ў строгім выкананні знешняй абрадавасці, культавага этыкету, Лаўрэнцій і Стэфан на першы план вылучалі сацыяльна-маральную актыўнасць чалавека. Прычым яна павінна была праяўляцца і як вынік маральна-духоўнага развіцця, і як яго сродак. Таму ў фармаванні прыстойнай асобы ўсё большая роля адводзілася маральнаму самаўдасканаленню. Паводле Л.Зізанія, сам Ісус Хрыстос — "тварное существо", і ўзвысіўся ён "своими добродетелями... до того, что в него вселяется сам Бог" [2, *101*].

Аддаючы належнае ўласным намаганням кожнага індывіда ў імкненні да духоўных вяршынь, браты Зізаніі падкрэслівалі выключна важную ролю выхавацеляў у фармаванні прыстойнай асобы. Л.Зізаній павучаў, што дзеці павінны паважаць сваіх настаўнікаў, як бацькоў: яны — тыя ж бацькі, толькі не па плоці, а па духу. С.Зізаній асабліва настойваў, каб духоўныя настаўнікі самі былі прыкладам для вахаванцаў. У кнізе "Казанье святого Кирилла..." ён рашуча асуджае дзеянні святароў, якія больш клапоцяцца аб уласным дабрабыце, чым аб выхаванні людзей.

Традыцыі народнай педагогікі, асноўныя пастулаты хрысціянскай этыкі, скіраванасць выхавання на фармаванне актыўнай, дзейнай асобы падводзілі братоў Зізаніяў да разумення працы як аднаго з асноўных маральна-выхаваўчых сродкаў. У вышэйадзначаным творы С.Зізаній ярка і пераканаўча паказвае, што марнатраўства, лянота, імкненне да непамернай раскошы апустошваюць душы і маральна разбэшчваюць людзей. Л.Зізаній таксама неаднаразова падкрэсліваў, што чалавек павінен жыць сваёй працай. Знамянальна, што разумовая праца адносілася асветнікамі да тых відаў дзейнасці, якія досыць жыватворна ўплываюць на фармаванне маральнасці чалавека. Не выпадкова, што Лаўрэнцій казаў аб вучобе як аб дабрачыннай працы: "За науку моцнося имаймо, и еден другого добродетального працею переходемо"[1, *138*].

Такім чынам, нават сцілы аналіз маральна-педагагічных поглядаў буйных дзеячаў эпохі Адраджэння дае ўяўленне аб адметнасці абранага імі накірунку ў справе фармавання прыстойнай асобы і яшчэ раз сведчыць аб глыбінных каранях агульнавыхаваўчых прыярытэтаў айчыннай педагогікі.


1. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии (Избранные произведения XVI— начала XIX в.). — Мн.: Навука і тэхніка, 1962.

2. *Ильинский Ф.* Большой катихизисъ Лаврентия Зизания. — Киев: Частный издатель, 1899.

3. *Зизаний Л.* Грамматика словенска съвершеннаго искуства осми частий слова и иных нуждных. Ново съставлена. — Вильно, 1596.

4. *Зизаний Л.* Толкованіе молітвы которой научил господь Ісус Христос оучеников своих // Божым шляхам. — 1976. — №3 (Лондан).

5. *Зизаний Л.* Поученіе, сказанное при погребеніи княгини Софіи Чарторыйской // Львовское ставропигіальное братство (Опытъ церковно-историческаго изследованія). — Киев, 1904.

6. *Зизаний С.* Казанье святого Кирилла патриаръхи иерусалимъского о антихристе и знакох его, з розширением науки против ересей розъных. — Вильно, 7104 (1596).